WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

12 ЧЭРВЕНЯ 2010 г. СУБОТА № 113 (26721)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА III КВАРТАЛ І II ПАЎГОДДЗЕ 2010 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

| Індэкс | месяц | III квартал | паўгоддзе |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 12400 | 37200 | 74400 |
| 63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў) | 11600 | 34800 | 69600 |
| 63858 (ведамасны) | 19900 | 59700 | 119400 |
| 63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры) | 18000 | 54000 | 108000 |

Заставайцеся з намі!

## Беларусь і Расія маюць намер паглыбляць кааперацыю ў сферы касмічнай прамысловасці

**Аб гэтым учора ішла размова ў час наведвання Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам навукова-вытворчага прадпрыемства «Усерасійскі навукова-даследчы інстытут электрамеханікі з заводам імя А. Г. Іасіф'яна», перадае БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, у свой час, калі абмяркоўвалася неабходнасць стварэння ў Беларусі ўласнага спадарожніка, было шмат скептыкаў гэтага праекта. Аднак Прэзідэнт зыходзіў з таго, што, па-першае, неабходна было захаваць існуючы ў рэспубліцы вытворча-навуковы патэнцыял, а па-другое, значна рушыць наперад. «Трактары вырабляліся і будуць вырабляцца, а гэта зусім новае», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, растлумачыўшы, што калі ў будучым якая-небудзь дзяржава і зможа пражыць без гэтых сучасных тэхналогій, то лічыцца перадавой яна ўжо не будзе.

У сувязі з гэтым Прэзідэнт Беларусі прапанаваў расійскім партнёрам унесці канкрэтныя прапановы па перспектыўных напрамках супрацоўніцтва з беларускімі прадпрыемствамі. Ён адзначыў, што няма неабходнасці дубліраваць ужо існуючую ў Беларусі базу і ствараць новую школу. «Яны ёсць у нашай Беларусі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Гэта прапанова выклікала цікавасць з боку расійскіх партнёраў. Яны ў сваю чаргу таксама прапанавалі Беларусі супрацоўніцтва па пашырэнні спектра задач, якія выконваюцца беларускімі спецыялістамі ў інтарэсах касмічнай прамысловасці ў Саюзнай дзяржаве. Пры гэтым удзел у розных сумесных праектах будзе ісці паралельна з падрыхтоўкай і навучаннем персаналу. Фактычна размова ідзе аб стварэнні ў Беларусі паўнацэннай уласнай касмічнай прамысловасці з вытворчай і навуковай базай. «Мы павінны атрымаць новы напрамак у эканоміцы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

## Неабходнай умовай работы Мытнага саюза Беларусь бачыць адмену абмежавальных мераў у пастаўках нафты і нафтапрадуктаў

**Адмена абмежавальных мераў у пастаўках нафты і нафтапрадуктаў — неабходная ўмова паспяховага функцыянавання Мытнага саюза. Аб гэтым заявілі БЕЛТА ў беларускай дэлегацыі, якая суправаджае кіраўніка дзяржавы ў ходзе яго візіту ў Расійскую Федэрацыю.**

Беларусь бачыць пазітыўныя вынікі, дасягнутыя пры фарміраванні МС, аднак сёння лічыць іх даволі сціплымі. «Беларусь не прымае выбарчага падыходу да прымянення пошлін», — падкрэслілі ў беларускай дэлегацыі, прывёўшы як прыклад тое, што расійскім бокам выбарачна прымяняюцца вывазныя мытныя пошліны на нафту і нафтапрадукты, якія пастаўляюцца ў Беларусь. У той жа час адносна Казахстана такія пошліны не прымяняюцца.

Беларусь у выпадку станоўчага завяршэння перагавораў не бачыць перашкод для таго, каб у самыя кароткія тэрміны правесці ўсе ўнутрыдзяржаўныя працэдуры, каб Мытны саюз функцыянаваў у поўным аб'ёме. У дэлегацыі лічаць, што паспяховая рэалізацыя гэтага праекта (афармленне МС і пазней стварэнне АЭП. — Заўвага БЕЛТА) у інтарэсах Расіі, якая прэтэндуе на дастойнае месца ў шэрагу не толькі рэгіянальных, але і сусветных лідараў. Ад гэтага залежыць і тое, ці будуць у далейшым іншыя краіны зацікаўлены ў далучэнні да саюза.

Што датычыцца газавай праблематыкі ў адносінах паміж Беларуссю і Расіяй, у беларускай дэлегацыі нагадалі: дамоўленасцямі 2006 года краіны павінны былі выйсці на роўнадаходныя цэны да 2011 года. Пры гэтым бакі дамаўляліся менавіта аб паралельным ходзе гэтага працэсу. Аднак расійскія ўлады па шэрагу эканамічных прычын заявілі аб планах перайсці да роўнадаходных цэнаў да 2015 года.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка знаходзіцца з рабочым візітам у Расіі. Запланаваны сустрэчы кіраўніка беларускай дзяржавы з Прэзідэнтам РФ Дзмітрыем Мядзведзевым і старшынёй расійскага ўрада Уладзімірам Пуціным. Асноўнай тэмай сустрэч стануць пытанні функцыянавання Мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі. Парадак дня перагавораў таксама ўключае актуальныя пытанні беларуска-расійскага супрацоўніцтва.

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Дзмітрыя Мядзведзева

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Мядзведзева і ўсіх расіян з нацыянальным святам — Днём Расіі.

Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце стала пачаткам новай эпохі ў гісторыі Расійскай Федэрацыі, што дазволіла павысіць ролю і аўтарытэт краіны на міжнароднай арэне.

## Прэзідэнт Беларусі павіншаваў Елізавету II

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Каралеву Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі Елізавету II з нацыянальным святам — Днём нараджэння Каралевы.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## У НЯДЗЕЛЮ — МОЦНЫ ДОЖДЖ І ГРАД!

Сёння даволі спякотнае паветра працягне паступаць у Беларусь з боку поўначы Афрыкі, паведаміў рэдакцыі **начальнік службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ**. Тэмпература паветра ўдзень плюс 30—34, па Гомельскай вобласці да 35, толькі ў паўночных раёнах — 24—29. Месцамі кароткачасовы дождж і навальніца. У нядзелю гарачыня спадзе і ўсталююцца даволі складаныя ўмовы надвор'я. Праз тэрыторыю Беларусі пачне рухацца вельмі актыўны атмасферны фронт. Амаль паўсюдна чакаюцца дажджы і навальніцы, пры навальніцах шквалістае ўзмацненне ветру, месцамі дажджы моцныя. Удзень у Гомельскай і Магілёўскай абласцях у асобных раёнах магчымы град. Тэмпература ўначы 12—17, па паўднёвым усходзе — да 23, удзень — 19—26, у Гомельскай вобласці — да 27—30. У пачатку наступнага тыдня ў нашу краіну прыйдзе антыцыклон з боку Заходняй Еўропы. Ападкаў амаль не будзе, толькі ў паўднёвых раёнах магчымы невялікі дождж. Тэмпература ўначы 6—11, па поўдні — да 15, удзень — 18—24.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Прамая лінія

### ДАПАМОГА: КАМУ ШТО?

Падтрымка ветэранаў і інвалідаў, адрасная сацыяльная дапамога, сацыяльнае абслугоўванне на даму і магчымасць атрымання іншых сацыяльных паслуг — усё гэта стане тэмай «прамой лініі» нашай газеты з удзелам **начальніка ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Івана Пятровіча НАГІБІНА**. **«Прамая лінія» пройдзе 15 чэрвеня з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах (8-017) 292 38 21 ці 292 38 92. Нумар для папярэдніх пытанняў — 287 17 57.**

Прамая лінія

### ЭНДАКРЫННАЯ СІСТЭМА

Дыягностыка і лячэнне цукровага дыябету 1-га і 2-га тыпаў, захворванняў шчытападобнай залозы, прафілактыка эндакрыннай паталогіі будуць у цэнтры ўвагі «прамой лініі» з удзелам **загадчыцы эндакрыналагічнага аддзялення Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Алены Іванаўны КУЗЬМЯНКОВАЙ**. Задаць пытанні спецыялісту можна **18 чэрвеня, у пятніцу, з 14.00 да 15.30** па рэдакцыйных нумарах: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумарах: 8 (017) 287 18 36 і 287 18 29.




Жыхарка вёскі Язна Мёрскага раёна Ларыса БЕРВЯЧОНАК не ўяўляе сваю сядзібу без багацця кветак і ўсмешак дачок Аксаны і Ганны.

## Уладзімір МАКЕЙ: «ТОЛЬКІ СЛАБАЯ ЎЛАДА БАІЦЦА ПРЭСЫ. ДЛЯ МОЦНАЙ УЛАДЫ АБ'ЕКТЫЎНЫЯ, ЖЫВЫЯ СМІ, НЕАБЫЯКАВЫЯ ЖУРНАЛІСТЫ — ГЭТА ДАПАМОГА...»

**Некалькі дзён запар умельцы клавіятуры і мікрафона з 18 краін адкрывалі новае для сябе і перадавалі веды маладой змене, знаёміліся з Беларуссю і адно з адным, абменьваліся вопытам, дыскутавалі, прыходзілі да агульных высноў. Разам. Супольна. Насычаная праграма пятага, юбілейнага, Беларускага міжнароднага медыяфоруму дазволіла калі не ахапіць неабдымнае, то шмат зрабіць дык дакладна. Агульнасць праблем, задач, інтарэсаў і ў нечым нават менталітэту дазвалялі рабоце сотняў удзельнікаў ісці спарней. Вымагала гэтага і сама тэма — «Партнёрства дзеля будучыні». Па-сапраўднаму грунтоўны ўнёсак у скарбонку задзіночання. І словам (а ключавое слова, несумненна, — інтэграцыя), і справай.**

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір МАКЕЙ** прапанаваў зрабіць міжнародны медыяфорум пастаянным і ў наступны раз правесці яго таксама ў Мінску.

— Сённяшні форум стаў выдатнай пляцоўкай для адкрытага, шчырага абмену меркаваннямі па любых пытаннях і даў магчымасць маладым журналістам набрацца вопыту ў мэтраў прафесіі, — сказаў ён.

Уладзімір Макей адзначыў, што СМІ — найважнейшы інструмент фарміравання грамадскай думкі. Але, на жаль, яны ўсё часцей становяцца мацнейшай зброяй у палітыцы і эканоміцы, сродкам лабіравання і ўплыву. Разам з тым, рост уплыву СМІ не заўсёды суправаджаецца ростам адказнасці.

— Важна, каб у кругавароце буйных і дробных інфармацыйных падстаў СМІ знаходзілі час ацаніць саміх сябе, магчымасць задумацца пра сваю сапраўдную ролю і наступствы для дзяржавы і грамадства, — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі. — Журналістам варта ўзяць на сябе частку віны і за эканамічныя праблемы ў свеце. Далёка не заўсёды яны здараюцца з-за памылак і пралікаў дзелавога плана. Не апошнюю ролю адыгрываюць чуткі, якія тыражуюць СМІ, і такім чынам нараджаюць паніку ў насельніцтва.



Фота БЕЛТА.

Уладзімір Макей заклікаў СМІ ўстанавіць маральныя абмежавальнікі: «Тое, што здавалася трывалым, сёння знішчаецца, тое, што меркавалася як святыня, падвяргаецца абразе... Гэта недапушчальна. Калі СМІ не ў стане аднавіць баланс у грамадстве і трымацца традыцыйных каштоўнасцяў, яны не павінны хоць бы ўсё гэта знішчаць і зневажаць».

Кіраўнік Адміністрацыі звярнуў увагу ўдзельнікаў медыяфоруму на існаванне розных трактовак свабоды слова. Для адных — гэта магчымасць казаць тое, пра што яны думаюць, для іншых — магчымасць хлусіць і рабіць грошы на правакацыях і плётках.

— Сёння асабліва востра стаіць пытанне аб экалогіі інфармацыйнай прасторы, — упэўнены Уладзімір Макей. — Свабода павінна быць не «ад», а «дзеля». Глыбока памыляецца той, хто лічыць што СМІ — гэта праблема для ўлады. Толькі слабая ўлада баіцца прэсы. Для моцнай улады аб'ектыўныя, жывыя СМІ, неабыякавыя журналісты — гэта дапамога, крыніца ведаў болевых кропак грамадства. Сёння свабодзе слова перашкаджае не ўлада, а грошы і зашмат інфармацыі.

Ствараць, а не разбураць, аб'ядноўваць, а не разрываць, збіраць, а не губляць — такія задачы ставілі перад сабой і шукалі спосабы іх вырашэння ўчора ўдзельнікі міжнароднага медыяфоруму.

— Правядзенне ў Беларусі такога маштабнага і значнага прафесійнага мерапрыемства, як міжнародны медыяфорум, сведчыць пра імкненне нашай краіны актыўна развіваць міжнароднае інфармацыйнае супрацоўніцтва, садзейнічаць кансалідацыі медыя-супольнасці постсавецкай прасторы, вырашэнню агульных праблем і задач, — зазначыў на пленарным пасяджэнні форуму **міністр інфармацыі Беларусі Алег ПРАЛЯСКОЎСКІ**. — Глыбока сімвалічна, што прадстаўнікі Расіі, усіх краін СНД і Балтыі, далёкага замежжа сабраліся ў Мінску ў год 65-годдзя Вялікай Перамогі. Гэта свяшчэннае свята, калі аддаюць даніну памяці пакаленню пераможцаў — тых, хто ў цяжкія гады ваеннага ліхалецця цаной усіх сілаў і нават уласнага жыцця адстаяў свабоду і незалежнасць Радзімы. Гэта самы лепшы прыклад сапраўднага патрыятызму і найвышэйшай адказнасці, адданасці свайму грамадзянскаму абавязку.

— Мы заўжды адкрытыя для добрых сяброў, гатовыя абмяркоўваць самыя складаныя і актуальныя праблемы, пашыраць гарызонты супрацоўніцтва, — запэўнівае кіраўнік інфармацыйнага ведамства Беларусі.

Ён перакананы, што СМІ «павінны больш актыўна ўключацца ў стваральныя працэсы, быць праваднікамі высокіх духоўных каштоўнасцяў, ідэй грамадскай кансалідацыі і супрацоўніцтва, талерантнасці і ўзаемаразумення — як на міждзяржаўным, так і на міжасабовым узроўні». Для сучаснага журналіста надзвычай важныя новыя веды і прафесійныя навыкі, пошук цікавых тэмаў і глыбіня даследавання, а таксама найвышэйшая сацыяльная адказнасць, увага і павага да сваёй аўдыторыі, — упэўнены міністр.

Пасяджэнне не абышлося без прыемных урачыстасцяў: наш калега з «Рэспублікі» Міхаіл Шыманскі атрымаў ганаровы знак Саюза журналістаў Расіі за заслугі перад прафесійнай супольнасцю. І без прыгожых алегорый: **дэпутат Генадзь ДАВЫДЗЬКА, старшыня асацыяцыі грамадскіх аб'яднанняў «Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў»** выказаўся пра саюзнае будаўніцтва надзвычай трапна:

— Мы будаўнікі, у тым ліку будаўнікі Саюзнай дзяржавы — муляры, бетоншчыкі, да страхароў яшчэ далёка, кладаўшчыкоў шмат ды іншых будаўнічых спецыяльнасцяў. Ёсць, вядома ж, у нашым будаўніцтве двое кіраўнікоў. І самае галоўнае, каб гэтыя двое кіраўнікоў, на якіх мы глядзім і спадзяёмся, памяталі адно (і мы таксама павінны гэта памятаць): заказчыкам гэтага будаўніцтва з'яўляецца народ, і, дарэчы, інвестарам таксама. Вельмі хацелася б, каб наш форум скончыўся на аптымістычнай ноце, каб было такое адчуванне, што на будоўлю бетон падвезлі — доўга не было, і тут падвезлі!

Што тут яшчэ дадаць... Няхай так і будзе!

Адным з лейтматываў пленарнага пасяджэння медыяфоруму стала выказванне **прэзідэнта даследчага холдынгу «Рамір» (Расія) Андрэя МІЛЕХІНА** пра тое, што сёлета спаўняецца 18 гадоў дзецям, якія былі народжаныя ўжо не ў СССР, а ў новай фармацыі. У гэтага пакалення няма настальгіі па Савецкім Саюзе, і калі мы не перададзім яму тое лепшае, што было ў нашым сумесным жыцці і гісторыі — здольнасць разам вырашаць агульныя праблемы, узаемадзейнічаць, разумець і паважаць адно аднаго — тады ўсім нам, і ў прыватнасці, журналістам, ад якіх насамрэч залежыць нямала, грош цана.

— Праблем шмат, але сёння як ніколі важна шукаць тое, што нас аб'ядноўвае, — заклікаў у сваёй прамове **першы намеснік старшыні Выканаўчага камітэта — Выканаўчага сакратара СНД Уладзімір ГАРКУН**.

А аб'ядноўвае нас не толькі мінулае. Сёння працуе нямала сумесных праектаў, адным з якіх, дарэчы, з'яўляецца і V міжнародны медыяфорум у Мінску. Нездарма на ім прадстаўлены СМІ ўсіх колішніх рэспублік Савецкага Саюза. Уладзімір Гаркун нагадаў таксама пра тое, што ў 2009 годзе свет убачыла ўнікальная кніжная серыя «Класіка літаратур СНД», выданне якой падтрымлівае Міждзяржаўны фонд гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц Садружнасці. Яшчэ адзін прыклад — Моладзевы сімфанічны аркестр СНД, якім сёлета на канцэрце ў штаб-кватэры ААН дырыжыраваў Уладзімір Співакоў....

Пра тое, што колішнія жыхары адной краіны здольныя плённа супрацоўнічаць, казаў і **намеснік Дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Сяргей ШУХНО**. Бюджэт Саюзнай дзяржавы за гады свайго існавання павялічыўся ў два разы. Толькі за мінулы год Беларуссю і Расіяй было падпісана больш за 40 сумесных праграм.



Фота БЕЛТА.

Нават калі ёсць поспехі і сумесныя справы, жыхары нашых краін пра іх ведаюць недастаткова. Для гэтага мог бы быць карысным і спецыяльны часопіс, заўважыў **выканаўчы дырэктар Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД Армэн СМБАЦЯН**.

— Сёння чытачы чакаюць ад нас шчырай і праўдзівай інфармацыі, сумленнай і пазітыўнай яе інтэрпрэтацыі, а не інфармацыйных войнаў, — сказаў у сваім выступе **галоўны рэдактар газеты «СБ. Беларусь сегодня» Павел ЯКУБОВІЧ**. — Прынцыповым з'яўляецца пытанне павагі да нашай краіны, яе палітычнага выбару і жыцця.

На жаль, заказную няпраўду, нібы па трафарэце, пішуць пра Беларусь не толькі журналісты краін далёкага замежжа, але і СНД. Прыходзіцца весці вострую і часам непрыемную палеміку ў абарону гонару Беларусі з калегамі, у тым ліку і з Масквы. Павел Якубовіч прывёў некалькі свежых прыкладаў з расійскіх выданняў, у якіх лічыцца добрым тонам пужаць чытачоў «жахлівымі» малюнкамі з Беларусі, якія не маюць нічога агульнага з рэальнасцю.

Удзельнікі медыяфоруму «Партнёрства ў імя будучыні» заклікалі актывізаваць інтэграцыйныя працэсы на постсавецкай прасторы з мэтай эфектыўнага супрацьдзеяння новым выклікам і пагрозам, забеспячэння міжнароднай бяспекі і справядлівага светаўладкавання. Гэты заклік сфармуляваны ў «Мінскай ініцыятыве», якую прынялі ўчора ў беларускай сталіцы журналісты і кіраўнікі розных СМІ з амаль двух дзясяткаў краін.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
**Зоя ВАРАНЦОВА.**

## СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА ЗА КРАСАВІК УЗРАСЛА НА 2 ПРАЦЭНТЫ

У Беларусі налічаная намінальная сярэднямесячная заработная плата склала ў студзені-красавіку бягучага года Br1 млн 57,7 тыс. — на 12,7 працэнта больш да ўзроўню студзеня-красавіка 2009 года. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.06.2010 г. (для б/н разлікаў)

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 3 018,00 |
| 1 еўра | 3 656,91 |
| 1 латвійскі лат | 5 162,95 |
| 1 літоўскі літ | 1 058,35 |
| 1 чэшская крона | 141,95 |
| 1 польскі злоты | 892,41 |
| 1 расійскі рубель | 95,97 |
| 1 украінская грыўня | 381,33 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 31,4471 |
| 10 UAH | 39,4816 |
| 1000 BYR | 10,4164 |
| EUR | 38,0982 |

ISSN 1990 - 763X

### ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**15 чэрвеня 2010 г. у 10.00** у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) прадоўжыць работу чацвёртая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА) ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «БЕЛСТРОЙМАТЕРИАЛЫ» (ПРОДАВЕЦ)

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже зданий и сооружений производственного участка, расположенного по адресу: **г. Смолевичи, ул. Торговая, 20а,** в составе здания вспомогательного корпуса, об. пл. 942,3 кв.м; объектов незавершенного строительства: складской корпус, об. пл. 6246 кв.м, административно-бытовой корпус, об. пл. 635,7 кв.м, склад ГСМ, об. пл. 33,8 кв.м, контрольно-проездной пункт (3х3м); канализационная насосная станция; очистные сооружения дождевых вод; прожекторная мачта (2 ед.); резервуары запаса воды (3 ед.); **железная дорога** (протяж. 1268,71 п.м.); ворота металлические; осветительные ж/б столбы (18 ед.); ограждение территории (275 бетонных плит); открытый склад под козловым краном (бетон. площадка); внутриплощадочные сети; внеплощадочные сети, а также оборудования. **Начальная цена с НДС** – 8 031 380 027 бел. руб. Площадь земельного участка **9,2953 га.** Задаток – 100 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 23.12.2009. Аукцион состоится **30.06.2010 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.06.2010 до 17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

Жыллё маё

## РЭГІСТРАЦЫЯ ДАГАВАРОЎ — ГАРАНТЫЯ БЯСПЕКІ ДЛЯ ДОЛЬНІКАЎ

**Мінбудархітэктуры працягвае далейшую працу па абароне інтарэсаў грамадзян-дольнікаў. Дзеля гэтага спецыялістамі галіны падрыхтаваны змяненні і дапаўненні ва ўказ кіраўніка дзяржавы № 326, дзе разглядаецца развіццё долевага будаўніцтва.**

Праектам распрацаванага дакумента прадугледжваецца ажыццяўляць рэгістрацыю дагавароў долевага ўдзелу, перад тым як яны будуць накіраваныя для пачатку фінансавання ў банк, паведаміў карэспандэнту «Звязды» **начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр ГОРВАЛЬ**.

Сёння, каб атрымаць дазвол на будаўніцтва, забудоўшчык будзе павінен зарэгістраваць дагавор аб долевым будаўніцтве з прыватнай асобай у мясцовым выканкаме, а потым выдаць зарэгістраваны дагавор грамадзяніну на рукі.

Толькі пасля прад'яўлення дольнікам зарэгістраванага дагавора банк будзе прымаць плату па лініі будаўніцтва жылля. Выканкам, які рэгіструе такія дагаворы, у сваю чаргу, павінен скласці базу звестак гэтых дагавораў на будаўніцтва жылля па пэўным адрасе. У гэтым выпадку зарэгістраваць паўторна дагавор на адно і тое ж жыллё будзе немагчыма. Мясцовы чыноўнік адразу заўважыць, што нумар дома і кватэры адпавядае аднаму жыллёваму памяшканню, а нехта спрабуе зарэгістраваць адразу два дагаворы. Такога ўжо не будзе, як у выпадку з падманутымі дольнікамі аднаго сумнавядомага дома на скрыжаванні вуліц Прытыцкага і Лабанка ў Мінску, дзе на адну кватэру прэтэндавалі адразу некалькі дольнікаў.

***— Цяпер інтарэсы дольнікаў будзе абараняць мясцовая ўлада?***

— Мясцовыя органы і раней неслі адказнасць за ўсё, што робіцца па лініі жыллёвага будаўніцтва, аднак у заканадаўстве часам узнікалі невялікія прававыя шчыліны, — удакладняе Аляксандр Горвель. — Сёння гэтай нормай цалкам выключаецца магчымасць прадаваць кліентам «паветраныя метры».

У праекце распрацаваны і больш дакладны парадак накіравання грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у долевае будаўніцтва. Такі парадак існаваў і раней, але былі пытанні. Цяпер удакладняецца сама працэдура такога накіравання, зыходзячы з існуючай практыкі: каму з чаргавікоў прапаноўваць долевае будаўніцтва ў першую чаргу, якім чынам фарміраваць спісы будучых дольнікаў і г.д.

Дакументам разглядаюцца пытанні аб выкарыстанні розных валют у якасці плацяжоў фізічнымі асобамі па лініі долевага будаўніцтва. Галоўным чынам кліенты аплачваюць квадратныя метры ў беларускіх рублях, але ёсць і забудоўшчыкі, якія працуюць з валютай. Праектам прапануецца прынцыпова замацаваць магчымасць выкарыстання ў долевым будаўніцтве замежнай валюты. Распрацаваны механізм узаемаразлікаў паміж кліентамі і арганізатарамі будаўніцтва ў выпадку скасавання дагавароў ці ўступлення новага члена ўжо на стадыі будаўніцтва.

Часцей за ўсё такой схемай аплаты карыстаюцца тыя забудоўшчыкі, сярод заснавальнікаў якіх ёсць інвестары з-за мяжы з першапачатковым капіталам у замежнай валюце. Часам за амерыканскую валюту кліентам прапануюць будавацца і айчынныя забудоўшчыкі. Тут дольнік самастойна павінен выбіраць, па якой схеме і з якой арганізацыяй яму лепш ажыццяўляць будаўніцтва. Разам з тым суразмоўца адзначыў, што сённяшнія вельмі моцныя ваганні галоўных сусветных валют, долара і еўра, добрага надвор'я і забудоўшчыкам, і дольнікам не зробяць. Тут магчыма атрымаць сур'ёзны даход, ці эканомію, а можна і прагарэць. Спецыялісты Мінбудархітэктуры прапануюць усім удзельнікам долевага будаўніцтва пры разліках выкарыстоўваць айчынную валюту.

***— Сёння многіх цікавіць пытанне, як зменіцца кошт будаўніцтва жылля для чаргавікоў сёлета і ў наступным годзе?***

— Кошт будаўніцтва пры любых выпадках будзе заставацца ў эканамічна абгрунтаваных рамках. Дынаміка змянення кошту будаўніцтва будзе залежыць ад многіх фактараў агульнага макраэканамічнага становішча краіны. Цяпер і на працягу апошніх месяцаў сярэдні кошт квадратнага метра жылля ў краіне стабільна трымаецца каля 500—550 долараў. У рэгіёнах будуецца крыху таннейшае жыллё, у сталіцы яно часам значна даражэйшае.

***— Сёлета кантрольныя органы пачалі больш звяртаць увагу на якасць будаўніцтва жылля. Ці не адгукнецца такая ўвага на тэмпах будаўніцтва і канчатковым кошце жылля?***

— Патрабаванні да якасці будаўніцтва сталі больш жорсткімі, але яны цалкам рэальныя і выканальныя. Запланаваныя аб'ёмы ўводу жылля будуць абавязкова выкананыя. Кошт будаўніцтва жылля вызначаецца згодна з праектна-каштарыснай дакументацыяй і беспадстаўна павялічвацца не можа. Калі нейкай будаўнічай структуры прыйдзецца ажыццяўляць пэўныя работы па выпраўленні сваіх памылак па лініі якасці будаўніцтва, то гэта будзе фінансавацца з уласных сродкаў арганізацыі, а не за кошт спажыўцоў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Факт**

## На Міншчыне з'явіцца парк ветракоў

**На тэрыторыі Міншчыны распачатая рэалізацыя інвестыцыйных праектаў па стварэнні чатырох лагістычных цэнтраў. Пра гэта паведаміў падчас сустрэчы з прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі ў рамках V Беларускага міжнароднага медыяфоруму намеснік старшыні Міналбвыканкама Віктар Шчэцька.**

Не менш цікавыя планы датычацца стварэння турысцка-экскурсійнага комплексу ў раёне Мінскага мора з прыцягненнем іранскага капіталу, а таксама стварэнне на тэрыторыі Міншчыны парку ветракоў. Наконт апошняга ўжо прынятае прынцыповае рашэнне, а непасрэдна выкананнем задумы мае заняцца адна з заходніх кампаній. Прычым, заўважыў Віктар Шчэцька, сам па сабе праект парку ветракоў падаецца перспектыўным. Першыя эксперыменты ў гэтым напрамку паказалі, што, нягледзячы на нібыта невялікую хуткасць ветру ў Беларусі, у цэлым за год ветракі выпрацоўваюць прыкладна столькі ж электраэнергіі, колькі ў краінах Захаду.

Дарэчы, заўважыў Уладзімір Шчэцька, Міншчына зацікаўленая ў прыцягненні інвестараў і, апроч прадастаўлення «агульных» ільготаў па падатках і мытных плацяжах, гатова хутка вырашаць пытанні з выдзяленнем зямлі. Пры гэтым адначасова рэгіён разлічвае на павелічэнне экспарту сваёй прадукцыі за мяжу — гаворка перш-наперш пра малочную і мясную прадукцыю, калійныя ўгнаенні і аўтамабілі БелАЗ.

**Сяргей ГРЫБ.**

## Беларуская прынцэса — лепшая

На міжнародным фестывалі дзіцячых тэатраў у Сербіі (горад Субоціца) **актрыса з віцебскага «Беларускага тэатра «Лялька» Вольга МАХАНЬКОВА** перамагла ў намінацыі «Лепшая жаночая роля». Такім чынам журы адзначыла яе выдатную ролю Прынцэсы ў спектаклі «Хлопчык-зорка». Гэты міжнародны фестываль, адзін з самых вядомых у Еўропе, праводзіўся вось ужо ў 17 раз.

Пасля ўдалага выступу ў Сербіі беларуская «Лялька» атрымала запрашэнне прыняць удзел у іншым міжнародным фестывалі — лялечных тэатраў у сталіцы Румыніі, які пройдзе напрыканцы года.

## Конкурс... вулічных музыкаў

**Лепшых беларускіх вулічных ролераў, музыкантаў, скейтбардыстаў, вулічных графітыстаў упершыню вызначаць на музычным «базары» ў Віцебску ў Дзень моладзі. Сотні хлопцаў і дзяўчат з усіх рэгіёнаў краіны прыедуць у Віцебск для ўдзелу ў маштабнай моладзевай акцыі.**

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі сёлета вырашыў здзівіць жыхароў горада і гасцей цікавымі навінкамі і мадэрнізмам.

Таксама ў Дзень моладзі адбудзецца традыцыйная бітва дыджэяў, будуць арганізаваныя дзіцячыя пляцоўкі.

Конкурсныя праграмы завершацца канцэртам «За намі будучыня», на якім выступяць маладыя прадстаўнікі ўсіх абласцей Беларусі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Калі не працуеш, мяжа пракорміць?

Каля Антопаля Драгічынскага раёна міліцыянеры спынілі машыну непрацуючага жыхара Дзівіна (вёска на мяжы з Украінай). У салоне было тавараў імпартнай вытворчасці на суму каля 85 мільёнаў рублёў без усялякіх дакументаў. А ў другога непрацуючага з Маларыцкага раёна знайшлі ў хаце таксама ўпакаваныя адзенне і абутак на суму крыху больш за пяць мільёнаў. Вядзецца праверка.

## Украў транспарцёр для гною

Практычна адначасова, у адзін дзень, у вёсцы Маравіль Бярозаўскага раёна скралі металічныя часткі катла ў кацельні, якая належыць раённаму ЖКГ, на суму больш за мільён рублёў, а з фермы Брадніца СВК «Вулькаўскія світанні» Лунінецкага раёна 20-гадовы злодзей выцягнуў стужку траспарцёра для выдалення гною коштам у 2 155 000 рублёў. Дзе толькі ён яе збываць збіраўся, незразумела. У абодвух выпадках зладзеі затрыманыя.

**Яна СВЕТАВА.**

## Захацелі мяса

У жыхара в. Вялікія Матыкалы (Брэсцкі раён) злодзей выкарыстаў прыхаваны гаспадаром ключ і выкраў з халадзільнай камеры 20 кг мяса.

А са свінакомплексу ААТ « Жураўлінае», які знаходзіцца ў в. Клепічы, праз акно ўкралі 4 парасят. Зладзеяў далёка не шукалі — двое мясцовых жыхароў і выцягнулі тых парасят.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

**Цэнтралізаванае тэсціраванне-2010**

# «СЛАБЫЯ МЕСЦЫ» — АРФАЭПІЧНЫЯ, АРФАГРАФІЧНЫЯ І ГРАМАТЫЧНЫЯ АДМЕТНАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**14 чэрвеня ў Беларусі афіцыйна стартуе прыёмная кампанія. Першымі ў пункты правядзення цэнтралізаванага тэсціравання прыйдуць маладыя людзі, якія ў якасці абавязковага экзамену па дзяржаўнай мове абралі беларускую мову. У гэтым годзе тэст па роднай мове пажадалі здаваць больш за 67 тыс. чалавек. Выходзіць першымі на старт экзаменацыйнага марафону заўсёды цяжэй, таму пажадаем ім поспехаў.**

На жаль, літаральна кожны год знаходзяцца абітурыенты, якія па ўласнай няўважлівасці і бязладнасці застаюцца за бортам уступнай кампаніі. У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў прыгадалі выпадак, калі маладыя хлопцы з Лунінца прыехалі здаваць тэсціраванне ў Пінск і... заблукалі ў трох вучэбных корпусах, спазніўшыся на экзамен. У Белдзяржуніверсітэце быў выпадак, калі абітурыент ужо здаў сваю тэставую работу і, не адыходзячы ад арганізатараў, выцягнуў з кішэні мабільны тэлефон, каб патэлефанаваць бацькам, хоць мабільныя тэлефоны ва аўдыторыях, дзе праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне, знаходзяцца пад строгай забаронай. Карыстаўся ці не карыстаўся абітурыент сваім тэлефонам, ніхто высвятляць не павінны. Хлопца было па-чалавечы шкада, але правілы — агульныя для ўсіх. Таму вынік тэста небаракі быў тут жа ануляваны... Здараецца, што абітурыенты забываюць прыхапіць з сабой на іспыт свой пропуск ці дакумент, які сведчыць іх асобу. Забываюць паставіць на пропуску пазнаку «цэнтралізаванае тэсціраванне прайшоў». А колькі памылак допускаюць абітурыенты пры запаўненні вобласці рэгістрацыі! Прыкладна кожны дваццаты абітурыент допускае ў вобласці рэгістрацыі хоць адну памылку. А своеасаблівы рэкорд — тры памылкі, допушчаныя ў імені Дзяніс.

Каб не допусціць крыўдных сітуацый, у гэтым годзе ўсіх абітурыентаў, якія прайшлі электронную рэгістрацыю на ЦТ, на зваротным баку пропуска праінфармавалі пра дакладнае месца праходжання ЦТ нават з указаннем маршрутаў гарадскога транспарту. Але праз электронную рэгістрацыю прайшлі прыкладна 60 працэнтаў удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання. Таму, каб не бегаць паміж карпусамі, на тэсціраванне лепш не спазняцца. Абітурыент, які прыбудзе ў пункт правядзення ЦТ пасля ўскрыцця пакета з педагагічнымі тэстамі, у аўдыторыю не допускаецца. З сабой на тэсціраванне абавязкова трэба прыхапіць чорную гелевую або капілярную ручку. Галоўнае, каб у чарнілах не было серабрыстага адцення. Некалькі гадоў таму ў адным з абласных цэнтраў абітурыенты масава закупілі такія вось ручкі, чым стварылі сур'ёзныя праблемы пры «чытанні» бланкаў адказаў. Высветлілася, што аргтэхніка дрэнна «бачыць» серабрыстыя чарнілы.

Абітурыенту забараняецца пранасіць, а таксама выкарыстоўваць у аўдыторыі, дзе праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне, любыя прадметы, акрамя пропуска, дакумента, які сведчыць іх асобу, і чорнай ручкі. Калькулятарам дазваляецца карыстацца толькі на тэсціраванні па фізіцы і хіміі, прычым калькулятар павінен быць з самымі простымі вылічальнымі функцыямі. Арганізатары забараняюць выкарыстоўваць інжынерныя, графічныя калькулятары, а таксама ўсе калькулятары, убудаваныя ў іншыя прыборы, напрыклад, у электронныя запісныя кніжкі, мабільныя тэлефоны і г.д.

Абітурыентам забараняецца мяняцца месцамі, выкарыстоўваць чужую дапамогу пры выкананні тэставых заданняў, размаўляць з іншымі ўдзельнікамі ЦТ. Абітурыент, які парушыў устаноўленыя патрабаванні, адхіляецца ад удзелу ў ЦТ. Яго бланк адказаў пагашаецца, а ў пропуску робіцца пазнака «Выдалены за парушэнні».

Пры атрыманні экзаменацыйных матэрыялаў абітурыент абавязаны пераканацца ў адпаведнасці нумара варыянта бланка адказаў нумару варыянта педагагічнага тэста. Абітурыент нясе адказнасць за захаванасць экзаменацыйных матэрыялаў з моманту іх атрымання да моманту перадачы арганізатарам тэсціравання. Папера для рабочых запісаў на тэсціраванні выдаецца абітурыентам у неабходнай колькасці. Многіх цікавіць, а ці можна будзе (у экстранным выпадку выйсці) з экзаменацыйнай аўдыторыі ў прыбіральню? Арганізатары запэўніваюць, што у гэтым ніхто перашкаджаць не будзе: абітурыент здае сваю экзаменацыйную работу арганізатарам, затым у суправаджэнні супрацоўніка ён можа пакінуць аўдыторыю, вярнуцца і прадоўжыць выпрабаванне. Аднак абітурыент пры гэтым губляе час, які даецца для выканання тэста. Пачаткам адліку часу, адведзенага на ЦТ, з'яўляецца час атрымання апошняга экзэмпляра педагагічнага тэста.

Абітурыент мае права ў працэсе тэсціравання заявіць арганізатарам, што нейкае заданне, на яго думку, складзена некарэктна, у ім утрымліваецца памылка ці не прыведзена правільных адказаў. Усе прэтэнзіі заносяцца ў пратакол з указаннем нумара варыянта педагагічнага тэста, нумара задання і змесу заўвагі. Пытанні абітурыентаў наконт змесу педагагічных тэстаў у экзаменацыйнай аўдыторыі не разглядаюцца. Працэдура апеляцыі на цэнтралізаваным тэсціраванні не прадугледжаная.

А цяпер колькі слушных парад ад метадыстаў Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў абітурыентам і іх бацькам, як рыхтавацца да тэсціравання і як паспяхова справіцца з экзаменацыйнымі выпрабаваннямі.

### ПАРАДЫ ДЛЯ БАЦЬКОЎ:

✓ Не хвалюйцеся за колькасць балаў, якія дзіця атрымае на ЦТ і не крытыкуйце яго пасля цэнтралізаванага тэсціравання. Унушайце яму думку, што колькасць балаў не з'яўляецца дасканалым вымярэннем яго магчымасцяў.

✓ Не павышайце трывожнасць дзіцяці напярэдадні ЦТ — гэта можа адмоўна адбіцца на выніках тэсціравання. Дзіцяці заўсёды перадаецца хваляванне бацькоў, і калі дарослыя ў адказны момант не могуць справіцца са сваімі эмоцыямі, то дзіця таксама можа эмацыйна «сарвацца».

✓ Падбадзёрвайце дзяцей, павышайце іх упэўненасць у сабе, бо чым больш дзіця баіцца няўдачы, тым большая верагоднасць памылак.

✓ Назірайце за самаадчуваннем дзіцяці, ніхто акрамя вас не зможа своечасова заўважыць і папярэдзіць пагаршэнне яго стану, выкліканае стамленнем.

✓ Кантралюйце рэжым падрыхтоўкі дзіцяці, не допускайце перагрузак, тлумачце яму, што заняткі павінны чаргавацца з адпачынкам.

✓ Забяспечце дзіцяці зручнае месца для заняткаў, прасачыце, каб ніхто з членаў сям'і яму не перашкаджаў.

✓ Звярніце ўвагу на харчаванне дзіцяці. Падчас інтэнсіўнага разумовага напружання яму неабходная пажыўная, разнастайная ежа і збалансаваны комплекс вітамінаў. Такія прадукты як рыба, тварог, арэхі, курага стымулююць работу галаўнога мозгу.

✓ Дапамажыце дзецям размяркоўваць тэмы падрыхтоўкі па днях. Не мае сэнсу зубрыць увесь фактычны матэрыял, дастаткова прагледзець ключавыя моманты і ўлавіць сэнс і логіку матэрыялу. Вельмі карысна рабіць сціслыя схематычныя выпіскі і табліцы, якія сістэматызуюць вывучаемы матэрыял. Калі дзіця не ўмее, то пакажыце яму, як гэта робіцца на практыцы. Асноўныя формулы і азначэнні можна выпісаць на паперках і павесіць іх над пісьмовым сталом, ложкам ці на кухні.

✓ Падчас трэніроўкі па тэставых заданнях прывучайце дзіця арыентавацца ў часе і ўмець яго размяркоўваць. Калі дзіця ўмее канцэнтравацца, гэта надасць яму спакой і зніме залішнюю трывогу. Напярэдадні цэнтралізаванага тэсціравання забяспечце дзіцяці паўнавартасны адпачынак. Ён павінен добра выспацца.

### ПАРАДЫ ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ:

✓ Час — галоўная каштоўнасць для ўдзельніка тэсціравання, таму вельмі важна правільна яго размеркаваць. Не менш важна навучыцца хутка пераключацца з адной тэмы на другую, з аднаго задання на другое. Пераходзячы да новага, пажадана забыць пра ўсё, што было ў папярэднім заданні. Як правіла, заданні ў тэстах не звязаныя адно з адным, таму веды, якія ўжо прымяняліся, не дапамагаюць, а толькі перашкаджаюць сканцэнтраваць увагу і правільна выканаць наступнае заданне. Сплануйце свой час работы так, каб паспець прабегчыся па ўсіх заданнях і вярнуцца на другі круг, такім чынам вы зможаце сабраць максімум ачкоў на «сваіх» заданнях і яшчэ застанецца час, каб падумаць над праблемнымі пытаннямі. Але ў спешцы можна допусціць прыкрую памылку, калі не дачытаць умовы задання да канца, а арыентавацца толькі па першых словах. Разам з тым, калі заданне будзе для вас не зусім зразумелым, варта зазірнуць у прапанаваныя варыянты адказаў — магчыма, іх змест дапаможа зразумець, што ад вас чакаюць стваральнікі тэста.

> **Прыкладна кожны дваццаты абітурыент допускае ў рэгістрацыі хоць бы адну памылку. А своеасаблівы рэкорд — тры памылкі, допушчаныя ў імені Дзяніс.**

✓ Неабходна ўдумліва, уважліва чытаць фармулёўкі да заданняў. Адрознівайце падобныя на першы погляд, але зусім супрацьлеглыя пытанні тыпу «Працяжнік на месцы пропуску ставіцца» і «Працяжнік на месцы пропуску не ставіцца», «Літара «а» пішацца ў словах» і «Літара «а» не пішацца ў словах». Можна падкрэсліць у фармулёўцы ключавыя словы, якія пастаянна трэба мець на ўвазе, абдумваючы правільныя адказы. Напрыклад, у фармулёўцы «Адзначце правільна запісаныя словы» варта выдзеліць словы «правільна запісаныя», у фармулёўцы «Адзначце прыметнікі, ад якіх не ўтвараюцца формы ступеняў параўнання» трэба падкрэсліць слова «не ўтвараюцца», бо, страціўшы ўважлівасць, можна памыліцца і адзначыць у бланку адказаў прыметнікі, ад якіх, наадварот, утвараюцца формы ступеняў параўнання.

✓ Для паспяховага выканання заданняў з часткі В важна патрэніравацца ў запаўненні бланка друкаванымі літарамі. Трэба мець на ўвазе, што адказ не залічваецца як правільны, калі ў напісанні слоў допушчаны арфаграфічныя памылкі. Адказ даецца толькі ў кароткай форме (слова, словазлучэнне ці цэлая лічба). Кожная лічба, літара ці знак мінус (калі лічба адмоўная) запісваюцца ў асобную клетачку. Адказ, які складаецца з двух слоў, пішацца злітна, без дэфісу, прабелу ці іншага падзяляльнага знака. Кожны сімвал хімічнага элемента, верхні і ніжні індэксы, адкрытую і закрытую дужку трэба ўносіць у асобную клетку. Для напісання сімвалаў хімічных элементаў варта выкарыстоўваць толькі вялікія літары.

Калі лічбавы адказ атрымліваецца ў выглядзе дробу, то яго варта акругліць да цэлай лічбы па правілах матэматычнага акруглення. Нельга запісваць адказ у выглядзе матэматычнай формулы ці выразу. Нельга ўказваць таксама і адзінкі вымярэння (градусы, працэнты, метры, тоны), даваць слоўныя загалоўкі ці каментары да лічбы.

✓ Некаторыя заданні можна вырашаць больш хутка, калі не шукаць адразу правільны адказ, а паслядоўна выключаць тыя, якія яўна не падыходзяць. Метад выключэння дазваляе канцэнтраваць увагу на адным-двух варыянтах, што значна спрашчае задачу. Лічыцца, што заданні размяшчаюцца па нарастанні ўзроўню складанасці, і выконваць іх трэба па парадку. Тым не менш паняцце складанасці — даволі суб'ектыўнае, і, магчыма, некаторыя заданні часткі В, якія не маюць падказак, менавіта для вас не будуць цяжкімі. Да таго ж з заданнямі часткі В спраўляецца меншая колькасць абітурыентаў, таму пры выстаўленні канчатковай адзнакі яны маюць большую «вагу», чым задачы часткі А. Балы за кожнае заданне налічваюцца, зыходзячы з таго, колькі ўдзельнікаў тэсціравання змаглі яго выканаць (камп'ютарная праграма вызначае так званы каэфіцыент складанасці). За выкананне складанага задання ўдзельніку тэсціравання налічваецца адпаведна больш высокі бал. А на тэсціраванні па рускай і беларускай мовах, дзе прадугледжаны заданні з некалькімі правільнымі адказамі, камп'ютар залічвае абітурыентам у тым ліку і часткова правільныя адказы.

✓ У беларускай мове ёсць асабліва складаныя для абітурыентаў раздзелы і пытанні, складаныя перш за ўсё па той прычыне, што для свабоднага валодання беларускай мовай трэба быць яе носьбітам. Вялікія цяжкасці традыцыйна выклікаюць заданні па арфаэпіі, накіраваныя на праверку вымаўлення і напісання галосных і зычных гукаў, асаблівасцяў націску ў беларускай мове. Прычым абітурыенты няправільна ставяць націск у словах, якія не толькі кожны год сустракаюцца ў тэставых заданнях, але і ўваходзяць у актыўную лексіку беларусаў. Праблемы ўзнікаюць з выкананнем заданняў на правапіс канчаткаў назоўнікаў, правапіс парадкавых і дробавых лічэбнікаў, правапіс прыслоўяў і слоў, блізкіх да іх. Слаба засвоеныя выпускнікамі ўтварэнне і ўжыванне дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў. Адным словам, пры падрыхтоўцы да ЦТ па беларускай мове асаблівую ўвагу трэба звярнуць на тыя арфаэпічныя, арфаграфічныя і граматычныя адметнасці беларускай мовы, якія складаюць яе спецыфіку, і на папаўненне свайго слоўнікавага запасу. Значную частку памылак на тэсціраванні складаюць пунктуацыйныя, асабліва на адасабленне дададных членаў сказа.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 14 июля 2010 года**

**ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже единым лотом принадлежащих ОАО «Минское производственное кожевенное объединение» Минский район (продавец) зданий, сооружений и иного имущества, расположенного по адресу: Минская область, Минский район, район поселка Гатово. В состав лота входит следующее имущество:**

| № п/п | Наименование и характеристики продаваемого имущества |
|---|---|
| 1. | Здание производственного корпуса общей площадью 8 957,0 кв.м, инв. номер 600/С-118240 |
| 2. | Склад ОКСа (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально технического снабжения, хранилищ площадью 430,9 кв.м, инв. номер 600/С-104462) |
| 3. | Контрольно-пропускной пункт № 3 (здание неустановленного назначения площадью 6,9 кв. м, инв. номер 600/С-104457) |
| 4 | Подъездные автодороги (асфальт) – 8 470 кв. м |
| 5 | Металлосетчатый забор (прямоугольные рамные конструкции из проволочной сетки на металлических опорах) – 374,0 м |
| 6. | Железобетонный забор (железобетонные панели на железобетонных опорах) – 139,0 м |
| 7 | Озеленение внешней площадки территории завода – 9193 кв. м |
| 8. | Подъездные железнодорожные пути – 108,2 м |
| 9. | Машина холодильная ХМ-ФУ 401 |
| 10 | Бак для охлаждения воды |
| 11. | Бак для разведения рассола ВПС-2,0-0,2 Г |
| 12. | Градирня |
| 13. | Шкаф силовой ЩР 11-73504 |
| 14. | Плита электрическая П-4 |
| 15. | Кипятильник КН 100 м |
| 16. | Линия ЛГС |

Имущество, входящее в состав лота, расположено на земельном участке площадью 2,8839 га, кадастровый номер 623684300001000395.

Имущество, входящее в состав лота, обременено договорами аренды.

Начальная цена – 7 910 000 000 белорусских рублей без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 395 500 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый лот. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Аукцион состоится **14 июля 2010 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 14.06.2010 по 12.07.2010** включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости» (ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск);**
**(+375 29) 636 86 81 – ОАО «Минское производственное кожевенное объединение» Минский район (р-н п. Гатово, 223017, Минский район, Минская обл.)**

## ШАНХАЙ, ДЗЕ МЫ НЕ БУДЗЕМ НІКОЛІ

*Але маем магчымасць ацаніць беларускі павільён на сусветнай выставе «Экспа-2010»*

**Адмысловы каларыт у павільёне Рэспублікі Беларусь дапамагла стварыць гісторыя, аб'яднаная з сучаснымі тэхналогіямі. У яго афармленні выкарыстаны 13 галаграмаў. Яны дапамаглі стварыць ілюзію таго, што вось тут і цяпер знаходзяцца ўнікальныя экспанаты Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі: пояс Вітаўта XIV стагоддзя, скарб сярэбраных манет, старажытныя фрэскі храмаў.**

І вось такая нябачная сувязь музея з Шанхаем працягваецца: што такое сусветная выстава, можа будзе даведацца з фотавернісажаў, што рыхтуе Нацыянальны гістарычны для сваіх наведвальнікаў. Праз фотаздымкі мы атрымаем уяўленне пра тое, якія павільёны былі ў іншых краін-удзельніц.

Больш за 60 фотаздымкаў увойдуць у экспазіцыю, якую арганізоўвае Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі і агенцтва «Сіньхуа». Гонар кітайцаў зразумець можна: для правядзення сусветнай выставы была абрана тэрыторыя ў цэнтральнай частцы горада, плошча якой 5,28 квадратнага кіламетра. Удзельнікамі форуму сталі больш за 200 краін свету і 50 міжнародных арганізацый. Сёлета дэвізам сусветнай выставы быў: «Лепшы горад — лепшае жыццё». Экспазіцыя кожнай з краін-удзельніц павінна была прадэманстраваць, як дзяржава дбае пра камфорт жыхароў сваіх гарадоў.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

**ГОСУДАРСТВЕННЫЙ КОМИТЕТ ПО ИМУЩЕСТВУ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

**ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ АУКЦИОНЕ**

**по продаже в процессе приватизации находящегося в республиканской собственности и хозяйственном ведении могилевского республиканского предприятия «Могилевэнерго» предприятия как имущественного комплекса (филиал Бобруйский завод древесноволокнистых плит)**

| | |
|---|---|
| **Наименование предмета аукциона:** | Имущественный комплекс филиал могилевского республиканского унитарного предприятия «Могилевэнерго» Бобруйский завод древесноволокнистых плит (далее – имущественный комплекс) и право заключения договора аренды земельных участков, необходимых для обслуживания объектов недвижимости, входящих в состав имущественного комплекса, сроком на 60 лет |
| **Местонахождение:** | г. Бобруйск, ул. Куйбышева, 29 |
| **Продавец, его местонахождение, контактные телефоны:** | Государственный комитет по имуществу Республики Беларусь, г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, тел. 2881152, 2944676 |
| **Начальная цена предмета аукциона:** | 19 036 972 763 (девятнадцать миллиардов тридцать шесть миллионов девятьсот семьдесят две тысячи семьсот шестьдесят три) рубля, в том числе: - имущественного комплекса в сумме 15 127 295 344 (пятнадцать миллиардов сто двадцать семь миллионов двести девяносто пять тысяч триста сорок четыре) рубля; - права заключения договора аренды земельных участков, необходимых для обслуживания объектов недвижимости, входящих в состав имущественного комплекса (срок аренды земельных участков 60 лет) в сумме 3 909 677 419 (три миллиарда девятьсот девять миллионов шестьсот семьдесят семь тысяч четыреста девятнадцать) рублей; |
| **Сумма задатка:** | 1 500 000 000 (один миллиард пятьсот миллионов ) рублей |
| **Условия продажи:** | - сохранение имеющегося количества рабочих мест в течение первых 12 месяцев с даты его приобретения, не менее 90 процентов этого количества рабочих мест в течение последующих 12 месяцев и осуществляемых имущественным комплексом видов деятельности в течение 5 лет; - инвестирование покупателем имущественного комплекса (далее – покупатель) в развитие производства в течение 3 лет с даты приобретения суммы, эквивалентной не менее 7 млн долларов США |
| **Оплата:** | 30 календарных дней после подписания договора купли-продажи |
| **Справочно:** | Имущественный комплекс расположен на земельных участках общей площадью 7,5217 га. Победителю аукциона передается в безвозмездное пользование без права распоряжения с условием сохранения целевого использования объект гражданской обороны (защитное сооружение) остаточной стоимостью 11 673 525 руб. |

Аукцион состоится **21 июля 2010 года в 11.00** по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, 5 этаж, актовый зал.

Желающим участвовать в аукционе необходимо заключить с Госкомимуществом соглашение о правах и обязанностях сторон и представить следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении;

индивидуальным предпринимателем – копию свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии;

юридическим лицом – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий;

иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь, расчетный счет 3604925280011 ф-л № 529 «Белсвязь» АСБ «Беларусбанк» г. Минск, пр. Независимости, 56, код 153001720; УНН 100745627; ОКПО 00034720.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Минск, пер. Краснозвездный, 12, каб. 504 (Фонд госимущества), с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (рабочие дни) **по 19 июля 2010 года включительно.**

Регистрация участников – **21 июля 2010 г. с 9.00 до 10.30.**

Победитель аукциона в день проведения торгов обязан подписать протокол о результатах аукциона.

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполкомом решения о предоставлении ему земельных участков обязан внести плату за право заключения договора аренды этих участков, в том числе плату за государственную регистрацию этих земельных участков и прав на них, возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

После совершения победителем аукциона названных платежей, но не позднее 2 рабочих дней, Государственным комитетом по имуществу с продавцом заключается договор купли-продажи имущественного комплекса, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка. Оплата за приобретенный имущественный комплекс осуществляется в течение 30 календарных дней после подписания договора купли-продажи.

Информация о продаваемом объекте размещена на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь: **www.gki.by.**

## «ПРІОРБАНК» ААТ — КЛІЕНТАМ

### Пакет паслуг «Пенсійны»: толькі перавагі

**У ЦБУ 505 г. Баранавічы адкрыты 1000-ы пакет паслуг «Пенсійны». Яго ўладальніцай стала пенсіянерка Зоя Маркушэўская, колішняя супрацоўніца банка.**

Ва ўрачыстых абставінах кіраўнік ЦБУ 505 Андрэй Туцкі павіншаваў Зою Мікалаеўну, уручыў ёй памятныя падарункі і выказаў надзею на далейшае плённае ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва: «Пріорбанк» надае вялікую ўвагу якасці і зручнасці абслугоўвання, імкнецца ствараць найбольш камфортныя ўмовы для атрымання пенсіі або дапамогі, праяўляе шчыры клопат аб пенсіянерах, а таксама дае магчымасць памножыць уласны капітал».

Пакет паслуг «Пенсійны» — гэта праграма пашыранага банкаўскага абслугоўвання пенсіянераў. Ад аналагічных прапаноў на рынку гэты пакет адрозніваецца шэрагам дадатковых паслуг, такіх як:

— аўтаматычнае атрыманне пенсіі на міжнародную бясплатную пластыкавую картку Visa Electron, якую кліент атрымлівае пры адкрыцці карт-рахунка «Пенсійны рахунак»;

— рассылка SMS-паведамленняў аб паступленні пенсіі на карт-рахунак;

— страхоўка ад нешчаслівых здарэнняў на суму 1 000 000 беларускіх рублёў за кошт банка;

— адкрыццё ўкладу «Пенсійны плюс», які афармляецца як у беларускіх рублях, так і ў доларах ЗША, і еўра (налічаныя працэнты па ўкладзе банк штомесяц аўтаматычна пераводзіць на картку кліента);

— паслуга «Планавы плацеж» — аўтаматычны штомесячны перавод любой сумы грошай у любы зручны дзень з карткі для папаўнення ўкладу, адкрытага ў банку.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### АЖЫЦЦЯВІЎ ПАГРОЗУ

Як расказаў карэспандэнту «Звязды» начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення ДАІ Андрэй Мяхед, сярод белага дня на прыпынку грамадскага транспарту «Электрамеханічны завод» у Брэсце душагуб з нажом накінуўся на жанчыну і стаў наносіць удары. Людзі паднялі крык, сталі клікаць міліцыю, і нападнік кінуўся на ўцёкі. Добра, што побач знаходзілася машына дарожна-паставой службы батальёна міліцыі. Інспектар ДПС Сяргей Пятручук дагнаў зламысніка і надзеў наручнікі.

Аказалася, што затрыманы 47-гадовы жыхар Брэста ўжо быў асуджаны за пагрозу забойства, якую і спрабаваў спраўдзіць зноў. Яго ахвярай стала 41-гадовая былая жонка, жанчына атрымала цяжкія пашкоджанні ўнутраных органаў і знаходзіцца ў бальніцы.

**Яна СВЕТАВА.**

## Чаму ў Беларусь эмігруюць грамадзяне Малдовы?

**Адказ на гэтае пытанне шукае ўдзельніца V Беларускага міжнароднага медыяфоруму, карэспандэнт малдаўскай тэлерадыёкампаніі «NIT» Святлана Чабан. Яна разам з іншымі членамі дэлегацыі падрабязна распытвала старшыню Гомельскага аблвыканкама Аляксандра Якабсона пра асаблівасці жыцця ў нашай краіне і прыцягальнасці яе для сваіх суайчыннікаў. Дарэчы, за некалькі дзён у Беларусі ў дзяўчыны склаліся і асабістыя ўражанні:**

— Краіна ўнікальная. Першае ўражанне — шмат святла і зеляніны, вельмі прыгожа. Другое, што вельмі ўразіла — вялізныя заводы, якія нагадваюць касмічныя караблі, дзе збіраюць іншаземную тэхніку: усё дакладна і тэхналагічна працуе. Мне здаецца, у гэтым заслуга нацыянальнага беларускага характару, звычка да парадку, сумленнасці — гэта выклікае толькі захапленне. Вядома, нас, замежных журналістаў, цікавіць і тое, як тут, на Гомельшчыне, спраўляюцца з наступствамі Чарнобыльскай катастрофы. Тое, што людзі да гэтага ставяцца вельмі спакойна, тое, што пастаянна рэалізуюцца нейкія праграмы — прыемна здзіўляе, хочацца даведацца больш пра гэта, распытаць, зразумець.

Карэспандэнт навінаў Нацыянальнай Тэлекампаніі Украіны Кацярына Бабак на Гомельшчыне ўпершыню:

— Нам пакуль што ўсё падабалася, але ж, мяркую, нас вазілі па тых месцах, якія не могуць не падабацца. Негатыву не пабачылі. Хоць у нас, ва Украіне, здаецца, больш развітыя гандлёвыя сеткі. Затое ў вас можна ўзяць вопыт працы на вялікіх вытворчасцях — як дакладна можна ўсё арганізаваць. У вас можна павучыцца чысціні на вуліцах, як узнімаць прадпрыемствы. У вас ёсць рабочыя месцы на заводах.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**Выстава**

## Паэты натхняюцца формамі

*Сугучнасць скульптуры і літаратуры канстатавалі ўдзельнікі выставы «Бронзаслоўе»*

**Не спрабавалі разглядаць скульптуры пад вершы? Ці заўважыць еднасць паміж словам і вобразам, які яно нясе, толькі выяўленым праз бронзу? Значыць, не былі на адкрыцці выставы ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры. А між іншым, праект «Бронзаслоўе», арганізаваны музеем і секцыяй скульптуры Беларускага саюза мастакоў, у нейкім сэнсе дае магчымасць адчуць, што скульптура — жывое мастацтва. Асабліва калі яно падмацаванае словам. Тым больш словам, якое сыходзіць ад чалавека.**

У дадзеным выпадку — літаратара. Беларускія літаратары з ахвотай далучаюцца да нейкіх неардынарных імпрэзаў, вельмі адкрытыя да зносінаў, і заўсёды рады пачытаць свае творы. Аб'яднанне бронзы і слова праілюстравалі выступленні Юрася БАРЫСЕВІЧА, Арцёма КАВАЛЕЎСКАГА, Іллі СІНА, Вікі ТЭРАНС, Міколы КАНДРАТАВА ды іншых аўтараў.

У беларускай сучаснай літаратуры і скульптуры вельмі шмат агульнага. Пагадзіліся з гэтым і скульптары, сярод якіх Сяргей АГАНАЎ, Юрый АНУШКО, Андрэй АСТАШОЎ, Сяргей БІЛЬДЗЮК, Валянцін БОРЗДЫЙ, Аляксандр БАТВІНЁНАК, Мікалай ДРОБЫШ і яшчэ шэраг творцаў. Кожная са скульптур — асобная цікавая гісторыя, якую адлілі ў метале і сагрэлі цеплынёй рук. Нібыта ажывілі. Бо ў сучаснай бронзавай адліўцы могуць быць перададзеныя нават адбіткі пальцаў аўтара...

Карацей, гэтыя творы таксама трэба ўмець чытаць: разумець думку аўтара, яго памкненні, магчыма, нават літаратурныя перавагі. Бо, аказваецца, і скульптура можа быць зроблена ў лёгкім жанры. А можа распавядаць нейкую філасофскую прытчу. Проста пачытайце.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Супраць сінякоў — холад і цыбуля

**Лечымся без лекаў**

**ГЕМАТОМА, або, прасцей, сіняк — гэта самае распаўсюджанае ў народзе пашкоджанне. Дробныя сінякі, як правіла, мы нават не заўважаем, а вось буйныя кровападцёкі (асабліва на твары) выклікаюць вялікі дыскамфорт. Як «даглядаць» гематомы з дапамогай традыцыйных і фітасродкаў?**

**Гематома** — гэта збіранне вялікай колькасці крыві, якое ўзнікла ў выніку разрыву сасуда пры ўдары. Сінякі могуць сустракацца як самастойна, так і спадарожнічаць іншым больш цяжкім траўмам (вывіхі, пераломы, пашкоджанні ўнутраных органаў). У гэтага простага пашкоджання ёсць нават свая класіфікацыя: паверхневая гематома, унутрымышачная і інш. Самастойна можна справіцца з паверхневымі гематомамі, астатнія — прэрагатыва ўрача. Асноўныя праявы паверхневых гематом — боль, прыпухласць, змяненне колеру скуры ад лілова-чырвонага да жоўта-зялёнага, павышэнне мясцовай тэмпературы. Найбольш часты зыход такой гематомы — разыходжанне. Але пры няправільным лячэнні гематома можа ўтварыць кісту, інфіцыравацца і нагнаіцца. З такімі сімптомамі трэба неадкладна звярнуцца да ўрача.

**Лечым гематому.** Непасрэдна пасля ўдару (як мага раней) прыкладзіце да пашкоджанага ўчастка на 1—3 гадзіны халодны кампрэс. Замест звычайнага лёду можна прыкладваць кампрэсы з гарэлкі. Змяшайце гарэлку з вадой (50/50), атрыманую сумесь наліце ў формачку для лёду і пастаўце ў маразільнік. Працірайце такімі кубікамі сіняк 3—4 разы на дзень. Калі пашкоджана рука або нага, пасля кампрэсу накладзіце тугую павязку. Пасля змяншэння вострых праяў з 2-га—3-га дня сінякі можна грэць (цёплым кампрэсам з солі).

**Бадзяга (парашок прэснаводнай губкі)** — добры сродак для пазбаўлення ад сінякоў. Для прыгатавання «мазі» 2 ст. лыжкі парашку трэба развесці ў 1 ст. лыжцы вады. Атрыманы раствор нанясіце на месца гематомы. Гаючае дзеянне бадзягі пачынаецца, як толькі пачне выпарацца вада. Мяняць павязку трэба 2 разы на дзень. Дзякуючы іголачкам бадзягі ўзмацняецца мясцовы кровазварот і разыходзяцца застоі крыві.

**Палын.** У склад палыну ўваходзіць хамазулен, які аказвае супрацьзапаленчае дзеянне, і шмат дубільных рэчываў. Для прыгатавання кампрэсу 100 г свежай травы здрабніце, змяшайце з такой жа колькасцю сметанковага масла і прыкладзіце да пашкоджанага месца на 20—30 хвілін.

**Трыпутнік (лісце)**. Прымяняецца гэтая расліна ў свежым выглядзе як болесуцішальны і супрацьзапаленчы сродак. Проста прыкладзіце хвілін на 15—20 здробнены або цэлы свежы ліст трыпутніку да выцятага месца — і ён пачне сваё гаючае дзеянне.

**Цыбуля.** Дзякуючы фоліевай кіслаце, якая ўдзельнічае ў працэсе кроватварэння, цыбульная кашка, накладзеная ў марлевай сурвэтцы на рану, ачышчае яе ад гною, змяншае боль, ацёчнасць і садзейнічае хуткаму разыходжанню.

**Прафілактыка**

## 10 правілаў добрай памяці: зубрыце і гуляйце ў сышчыка

- Кожны дзень на працягу 30 секунд неабходна адначасова перамяшчаць зрэнкі з боку ў бок. Гэтае практыкаванне ўзмацняе каардынацыю абодвух паўшар'яў мозга і садзейнічае актывізацыі яго зон, адказных за памяць.
- Гуляйце ў шахматы, разгадвайце крыжаванкі, рэбусы, дапамагайце дзецям або ўнукам вучыцца. Можна, напрыклад, зрабіць падборку матэрыялаў для даклада або рэферата на новую, невядомую вам тэму.
- Вучыце вершы. Напрыклад, можна паставіць сабе задачу кожны дзень вывучваць па раздзелу з «Новай зямлі» і дэкламаваць іх, пступова павялічваючы памер вывучанага.
- Калі вам трэба запомніць доўгі рад літар або лічбаў, разбіце гэты рад на групы па 3—4 пазіцыі, напрыклад 222 771 88 06. Кароткія групы запомніць лягчэй.
- Па магчымасці не карыстайцеся калькулятарам там, дзе можна зрабіць нескладаныя вылічэнні ў галаве.
- Не спрабуйце рабіць адразу некалькі спраў адначасова, сканцэнтруйцеся на выкананні адной справы.
- Зубрыце. Дзеянне, якое ганяць у школе, насамрэч цудоўны спосаб запомніць і ўтрымаць у памяці вялізныя аб'ёмы інфармацыі. Тэарэма або параграф падручніка, якія вы добра вызубрылі і адказалі ў 6-м класе, захаваліся ў памяці ў нязменным выглядзе і могуць быць вамі аднаўленыя праз 30—40 гадоў.
- Добры спосаб лепш і хутчэй запомніць што-небудзь — гэта паспрабаваць растлумачыць іншаму чалавеку тое, што трэба зразумець і запомніць вам. Рыхтуючыся да даклада або гутаркі з начальствам апрабуйце сваю прамову на хатніх, тады ў рэальнай абстаноўцы вам не давядзецца «завісаць», прыпамінаючы патрэбнае слова або аргумент.
- Гуляйце ў сышчыка. Напрыклад, паспрабуйце як мага больш падрабязна запомніць прыкметы пасажыра, які сядзіць насупраць вас у транспарце. Успомніце гэтыя прыкметы як мага больш падрабязна праз некалькі дзён, як быццам вам трэба скласці слоўны партрэт злачынца.
- Пазбягайце лішняй інфармацыі: пустых размоў, чытання бульварнай прэсы. Калі хочацца паглядзець ТБ, выберыце адну праграму, а не «падарожнічайце» пультам па ўсіх каналах.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Віктар КАЛАМІЕЦ:

# «У БЕЛАРУСІ І ВА УКРАІНЕ СЭКС ЁСЦЬ... І СЭКС ЯКАСНЫ»



**У межах аднаго з праектаў Фонду ААН у галіне народанасельніцтва ў сталіцы нядаўна прайшоў семінар-падрытоўка нацыянальных экспертаў-трэнераў па праблемах планавання сям'і, захавання сэксуальнага і рэпрадуктыўнага здароўя людзей, якія жывуць з ВІЧ/СНІД. Адным з вядучых семінара быў кансультант Фонду ААН у галіне народанасельніцтва, трэнер-кансультант Кіеўскага цэнтра планавання сям'і, сэксуальнага і рэпрадуктыўнага здароўя Віктар КАЛАМІЕЦ, які з задавальненнем пагадзіўся адказаць на некалькі пытанняў спецыяльна для газеты «Звязда». Дарэчы, традыцыйна ва Украіне былі і ёсць вядомыя як у СНД, так і ў свеце навуковыя школы. Яны шмат гадоў, яшчэ за савецкім часам, развівалі сэксалогію як навуку, і працягваюць гэта рабіць сёння.**

***— Віктар, што павінны ведаць бацькі пра сэксуальнае выхаванне дзіцяці?***

— Па-першае, бацькі павінны ведаць, што сэксуальнае, палавое выхаванне дзіцяці адбываецца нават тады, калі бацькі спецыяльна і мэтанакіравана «не выхоўваюць» яго. Іншымі словамі, дзеці імітуюць паводзіны бацькоў, іх манеру стасункаў з асобамі супрацьлеглага полу нават у самых звычайных сітуацыях — у магазіне, транспарце, на вуліцы. Таму тату мала спецыяльна арганізаваць выхаваўчую размову з сынам і хвілін трыццаць расказваць пра тое, як павінен паводзіць сябе сапраўдны мужчына з жанчынай. Тата павінен яшчэ і ўласным прыкладам штодзённа, не задумваючыся пра гэта, паколькі гэта ёсць натуральнае, нармальнае жыццё, паказваць сыну — сваімі дзеяннямі, учынкамі, словамі, — які́м павінен быць сапраўдны мужчына. І часта такое натуральнае выхаванне аказвае большы ўплыў на фарміраванне дзіцяці, чым добра прадуманыя выхаваўчыя лекцыі.

Па-другое, бацькам абавязкова трэба ведаць пра палавое развіццё дзіцяці, тыя фізіялагічныя і псіхалагічныя этапы ў развіцці, якія перажывае іх дзіця. Такія веды можна атрымаць у спецыялістаў або са спецыяльнай літаратуры. Справа ў тым, што далёка не ўсе этапы могуць быць беспраблемнымі. Напрыклад, падлеткавы ўзрост называюць крызісным, і ў многім ад бацькоў залежыць, якога «памеру і шуму» будзе гэты крызіс. Бацькі павінны ведаць аб надыходзе змен у развіцці дзіцяці і інфармаваць яго — самастойна або з дапамогай спецыялістаў — пра гэтыя змены. Зразумела, бацькі павінны спакойна рэагаваць на такія змены ў дзецях.

Па-трэцяе, бацькі павінны добра ўсвядоміць, што найлепшая «зброя» супраць магчымых непрыемнасцяў і праблем у галіне міжпалавых стасункаў для дзяцей, якія падрастаюць, — гэта своечасова атрыманая інфармацыя. Святое месца пустым не бывае. Таму калі бацькі самі не праінфармуюць дзіця, то гэта абавязкова зробіць нехта іншы — сябры, незразумелыя артыкулы ў газеце, забаўляльныя сайты ў інтэрнэце і г.д. І наўрад ці такая інфармацыя будзе дакладнай. Калі ж бацькі саромеюцца або надта занятыя, то лепей даверыць размову аб узаемаадносінах паміж поламі спецыялістам.

***— Якую ролю ў вышэйзгаданым выхаванні павінна адыграць школа?***

— Чаго не трэба рабіць — ні бацькам, ні спецыялістам, наогул усім, каму цікавая гэта тэма, — дык гэта цалкам перакладваць на школу функцыі «выхавальніка». Нельга думаць, што дастаткова аддаць дзіця ў 7 гадоў, як у 17 ужо можна забіраць зусім выхаванага ў сэксуальных адносінах грамадзяніна. Варта добра разумець, што школа — гэта толькі адзін з соцыумаў у жыцці дзіцяці, які, зразумела, уплывае на развіццё, але роўна ў такой жа ступені ўплывае і вуліца, і СМІ, і бацькі, і трэнер у спартыўнай секцыі, якую наведвае дзіця, і г.д.

Выхаванне ў школе залежыць ад выхавацеляў — настаўнікаў. Адны настаўнікі з душой ставяцца да сваёй працы, перажываюць за сваіх выхаванцаў, імкнуцца акрамя ведаў па геаграфіі і матэматыцы яшчэ сфарміраваць са сваіх падапечных яркіх асобаў, выхаваць у іх павагу адзін да аднаго, узаемадапамогу і ўзаемаразуменне паміж хлопчыкамі і дзяўчынкамі, выхаваць пачуццё будучага адказнага бацькоўства. Іншыя настаўнікі так не робяць. Па-рознаму ж можна прачытаць урок валеалогіі — у аднаго настаўніка атрымліваецца цікава і жыва, у другога — фармальна і суха. Безумоўна, роля школы вельмі вялікая ў выхаванні дзяцей хоць бы таму, што дзіця праводзіць шмат часу ў школе, але бацькам заўсёды трэба памятаць і пра ўласную ролю ў выхаванні дзяцей. Школе замяніць бацькоў вельмі складана.

***— Што можна пажадаць падлетку, які разважае зараз над тым, ці не пачаць яму з заўтрашняга дня палавое жыццё?***

— Пажадаць уявіць вагі! Так, простыя вагі, на адну шалю якіх падлетак пакладзе ўсе «за» палавога жыцця, напрыклад, атрыманне задавальнення, упадабненне равеснікам і г.д. На другую шалю вагаў трэба пакласці ўсе «супраць», напрыклад, верагоднасць заражэння ганарэяй ці ВІЧ, непажаданую цяжарнасць, аборт з бясплоднасцю ў будучыні, пытанне «а раптам тата дзяўчынкі даведаецца і што ён са мной зробіць»? Калі шаля з аргументамі «за» перамагла, то, прынамсі, гэты крок — пачатак палавога жыцця — будзе не такім спантанным, як гэта часцей за ўсё бывае. З вагамі падлетку трэба папрацаваць спакойна, без спешкі. Адзін дзень тут нічога не вырашыць. Калі раптам высветлілася, што нешта не зразумела або проста невядома — напрыклад, шляхі перадачы ВІЧ, то лепей больш падрабязна даведацца пра гэта і многае іншае...

***— Як павінны рэагаваць на сэксуальны вопыт дзіцяці бацькі, якія даведаліся пра такі факт ад яго самога ці здагадаліся па ўскосных доказах?***

— Зразумела, калі дзіця ўжо мае пашпарт і скончыла школу, то гэта, хутчэй за ўсё, ужо не «дзіця», хоць дзеці заўсёды будуць дзецьмі сваіх бацькоў незалежна ад таго, колькі ім гадоў... У такім выпадку да месца будзе дарослая спакойная размова, калі ў ёй маюць патрэбу бацькі. Павінна быць размова сапраўды дарослых людзей, дзе ўвага акцэнтуецца не на сэксе як ён ёсць, а на тым, што ёсць адносіны, ці ёсць пачуцці, ці ёсць разуменне наступстваў такіх адносінаў і г.д. Гэта вельмі важна: размова дарослых людзей пра дарослы бок жыцця!

Аднак калі гэта дзяўчынка 12-13 гадоў ці нават крышку старэйшая, то такая размова, натуральна, неабходная. Многія падлеткі ў гэтым узросце з'яўляюцца закладнікамі свайго развіцця — цела ўжо амаль вырасла, а свядомасць, уключаючы інфармаванасць аб сэксе, адказнасць за свае ўчынкі, уменне планаваць сваё жыццё — яшчэ проста не сфарміраваліся. Таму бацькі маюць рацыю, калі ў падобнай сітуацыі спрабуюць умешвацца ў жыццё дзяцей. Нельга быць абыякавым, калі бачыш, што чалавек кінуўся на глыбіню ракі толькі таму, што ў яго выраслі рукі і ногі. Мы разумеем, што ён можа патануць, бо трэба яшчэ навучыцца плаваць. І тут пытанне: як мы кідаемся ратаваць гэтага чалавека (размаўляць з дзіцем) — кідаемся ў ваду і актыўна плюхаемся побач, каб ад пырскаў і хваляў той, хто тоне, яшчэ хутчэй нахапаўся вады, ці спакойна, паціху падбіраемся і выцягваем яго ў бяспечнае месца? Больш разумна, вядома, дзейнічаць спакойна і ціха, не ўзнімаць хваляў. Акуратна ў размове разведаць, ці не памыліліся мы? Не трэба запалохваць, каб не згубіць давер. Тады надалей дзіця будзе пытацца пра штосьці інтымнае ў бацькоў, а не на вуліцы. Дарэчы, часам бацькі сваім плюханнем могуць падштурхнуць дзіця да вулічнага выхавання. Трэба заваёўваць давер дзіцяці або шукаць дапамогі ў спецыялістаў.

***— Што вы думаеце пра ролю інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам, у жыцці сучаснага грамадства? Няўжо ўсё так дрэнна?***

— На жаль, распаўсюджанасць ІППШ, венерычных захворванняў і ВІЧ на сёння носяць характар эпідэміі. Гэта факт, і пра гэта трэба гаварыць. Таксама факт, што адной з прычын катастрафічнага скарачэння насельніцтва з'яўляецца бясплоднасць, а адной з вядучых прычын бясплоднасці з'яўляюцца перанесеныя ІППШ. І гэта толькі адзін з прыкладаў. Безумоўна, неабходна спрабаваць актыўна ўплываць на гэты ланцужок урачам, валанцёрам грамадскіх арганізацый, палітыкам, журналістам і г.д.

Большасць ІППШ, а асабліва ВІЧ — гэта вынік рызыкоўных паводзінаў, імпульсіўнасці і неабдуманасці ў кантактах, часта на фоне ўжывання псіхаактыўных рэчываў. Такія паводзіны трэба мяняць. На шчасце, ВІЧ не перадаецца паветрана-кропельным шляхам. Элементарныя правілы бяспечных паводзінаў дазваляюць пазбегнуць заражэння. Такім чынам, прагноз залежыць ад саміх людзей, ад таго, наколькі яны будуць адказнымі за сваё жыццё.

***— У якой ступені сэкс — дзеля дзяцей, а ў якой — дзеля задавальнення?***

— У сэксалогіі вылучаюць тыпы сэксуальнай матывацыі. У некага матыў да сэксу — атрымаць задавальненне, у некага — атрымаць выгаду або ўзнагароду, у некага — нарадзіць дзіця, у некага — выразіць падзяку і г.д. У некаторым сэнсе, колькі людзей — столькі і матываў. Хоць, вядома, апошнія можна класіфікаваць у падобныя групы. Варта памятаць, што сэксуальная матывацыя ў аднаго і таго ж чалавека можа мяняцца ў залежнасці ад настрою, жыццёвага вопыту, стасункаў з партнёрам і г.д. Але відавочна тое, што такі матыў як «дзеля дзяцей» павінен быць сапраўды абдуманым і ўзважаным, гэта і ёсць прыкмета сфарміраванага пачуцця — адказнага бацькоўства. Таксама відавочна, што сэксуальнае жыццё ў гарманічнай пары з'яўляецца натуральным бокам іх жыцця, а значыць, і задавальненне ад сэксу, і нараджэнне дзіцяці ў атмасферы кахання знаходзяцца ва ўзаемнай сувязі. І немагчыма, дый не трэба спрабаваць раздзяліць гэтыя два матывы. Трэба заўсёды імкнуцца да гармоніі ў адносінах.

***— Якія складовыя — псіхалагічныя, фізіялагічныя — можна аднесці да правілаў добрага сэксу?***

— З аднаго боку, усё правільна: калі мы хочам добра, без праблем і з задавальненнем ездзіць на аўтамабілі, мы проста абавязаны вывучыць і прытрымлівацца «правілаў добрага дарожнага руху». Але сэкс — матэрыя больш тонкая, ён не пачынаецца і не заканчваецца пасля выключэння запальвання. Сэкс як зносіны пастаянны, як пастаянныя два полы — мужчынскі і жаночы. Таму першым псіхалагічным правілам добрага сэксу з'яўляецца пастаянная гармонія паміж мужчынам і жанчынай. Але і зноў жа, не ўсё тут так проста. Бываюць пары, якім для добрага сэксу як раз патрэбна эпізадычная дысгармонія, і такія зрушэнні-спрэчкі могуць выконваць функцыю гармоніі менавіта ў іх пары.

Любіць іншага і адчуваць ад яго тое ж, узаемная павага і ўчынкі, разуменне таго, што мяне прымаюць такім, які я ёсць, і рабіць гэтак жа — гэтыя і яшчэ вельмі шмат правілаў добрага ў сэксе. І наўрад ці гэта пафасныя правілы, наўрад ці гэта ўтопія. Правілы простыя, і ўсё залежыць ад самога чалавека. А далей нівеліруюцца правілы фізіялагічныя. Бо калі чалавек трымаецца правілаў добрага сэксу з любімым партнёрам, то аўтаматычна ён будзе вытрымліваць асабістую гігіену, сачыць за сваім здароўем і знешнім выглядам.

***— Адна справа, калі сэксу не было ўсё жыццё — бывае ж і такое... Але, дапусцім, сэкс то ёсць, то яго няма. Напрыклад, у першай палове жыцця ён ёсць, а пасля 40—50 — няма... Як гэта можа адбіцца на здароўі людзей з рознай палавой канстытуцыяй?***

— З аднаго боку, сэксуальная функцыя ў арганізме чалавека такая ж натуральная, як і стрававальная. А значыць, яна павінна функцыянаваць. Зразумела, жыццё разнастайнае, і бываюць сітуацыі, і сітуацыі аб'ектыўныя, калі сэксу няма — ці то ўсё жыццё, ці то працяглыя перыяды. З іншага боку, чалавечы арганізм — гэта вельмі складаная і мудрая сістэма самарэгулявання. Калі штосьці не працуе, то гэта кампенсуецца нечым іншым — для захавання максімальна здаровай раўнавагі ў арганізме. Напрыклад, калі слабее зрок, абвастраецца слых, калі не праяўляецца сэксуальная функцыя, энергія траціцца на нешта іншае, напрыклад, на творчасць.

Гэта праўда, што сэксуальны патэнцыял чалавека залежыць ад тыпу палавой канстытуцыі, але праўда і тое, што не толькі ад яго. У роўнай ступені, а бывае, і ў большай, уплыў аказваюць, напрыклад, пачуцці да партнёра. Пачуцці якраз з'яўляюцца вядучым матывам сэксуальных паводзінаў чалавека. Таму нельга сцвярджаць, што чалавек з моцным тыпам палавой канстытуцыі больш моцна пацярпіць у сваім здароўі, чым чалавек са слабым тыпам. Магчыма, працяглае ўстрыманне яму будзе давацца цяжэй, але і шляхоў выхаду нерэалізаванай сэксуальнай энергіі будзе больш, напрыклад, больш інтэнсіўныя эратычныя сны, больш актыўная і інтэнсіўная зацікаўленасць нейкай справай і г.д.

І яшчэ адзін важны момант з пункту гледжання шкоды для здароўя з-за адсутнасці сэксу: сэксуальная функцыя патрабуе трэніроўкі, іншымі словамі, рэгулярнасць у практыкаваннях сэксам з'яўляецца адной з галоўных умоў яго паспяховасці. Калі ж гэтай рэгулярнасці няма, або сэкс наогул перастае існаваць у жыцці чалавека, арганізм у нейкім сэнсе «забывае» гэту функцыю, яна «засынае». Можна параўнаць такую сітуацыю з заняткамі спортам. Калі мы хочам быць добрымі спартсменамі, то проста абавязаны рэгулярна трэніравацца. Калі мы перастаём гэта рабіць, арганізм «забывае» трэніроўкі і пра тую групу мышцаў, якая трэніравалася... Але! Усё роўна нічога катастрафічнага ў гэтым сэнсе не здарыцца. Хочам зноў у спартсмены — аднаўляем трэніроўкі, «будзім» арганізм!

***— Як наогул звязаны сэкс і здароўе?***

— Напрамую. Гэта ўжо даказана, адзначана гінеколагамі, уролагамі, псіхатэрапеўтамі і інш. Натуральна, сэкс як такі павінен быць — для агульнага тонусу арганізма, для гарманічнага функцыянавання гарманальнай сферы, для псіхаэмацыйнай раўнавагі. І зваротная сувязь: калі ёсць усе вышэйзгаданыя «для...», то чалавек сам імкнецца да сэксу. Свайго роду замкнёнае кола, дзе ёсць узаемаабумоўленасць прычын і следстваў.

Акцэнт хацелася б зрабіць на іншым — на тым, што сэксуальнае жыццё чалавека не павінна зводзіцца да механічнага сэксу, простай сэксуальнай разрадкі. Бо псіхалагічнае задавальненне, адчуванне гармоніі ад сэксуальных адносінаў з каханым чалавекам часта з'яўляюцца значна больш моцным фактарам, які ў выніку ўмацоўвае здароўе. Таму, нягледзячы на многія і часта зразумелыя прычыны — у чалавека няма на гэты момант гарманічных адносінаў, няма пары, — усё ж такі лепш імкнуцца да, так бы мовіць, духоўна-фізіялагічнага сэксу, а не проста да фізіялагічнага.

***— У Беларусі на 1 мільён насельніцтва прыпадае 1 урач-сэксолаг. Нашы сэксолагі кажуць, што гэта сведчыць у тым ліку пра нізкую сэксуальную культуру ў краіне, што сэкс не ўваходзіць у якасць жыцця беларусаў. А як з гэтым справы ва Украіне? У вашай краіне больш сэксу?***

— Думаю, параўнанні ў гэтым выпадку будуць некарэктнымі... Упэўнены, што і ў Беларусі, і ва Украіне сэкс ёсць, і ён... якасны!

**Святлана БАРЫСЕНКА.**



Фота Пятра ФАМІНА.

**МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ** *15 июля 2010 г.* **ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В МИНСКОМ РАЙОНЕ**

| | | Лот 1 | Лот2 | Лот 3 | Лот 4 | Лот 5 | Лот 6 | Лот 7 | Лот 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Адрес земельного участка | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 739, У-12 | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 796, У-23 | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 796, У-6 | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 796, У-4 | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 739, У-18 | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 736, У-6 | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 736, У-9 | Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал 735, У-11 |
| 2 | Кадастровый номер | 623683403101006162 | 623683403101006181 | 623683403101006180 | 623683403101006179 | 623683403101006173 | 623683403101006175 | 623683403101006176 | 623683403101006171 |
| 3 | Площадь земельного участка | 0,1490 га | 0,1480 га | 0,1489 га | 0,1515 га | 0,1583 га | 0,1546 га | 0,1515 га | 0,1667 га |
